**УДК 81’373.211.5(476)**

# НАЗВЫ ВУЛІЦ г.п. БЯЛЫНІЧЫ Ў ТАПАНІМІКОНЕ МАГІЛЁЎШЧЫНЫ: ДА ПРАБЛЕМЫ ПАЎТАРАЛЬНАСЦІ

***д-р філал. навук, праф. Г.М. МЕЗЕНКА***
***(Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава)***
***mezenka1@yandex.ru***

*У артыкуле даследуецца праблема паўтаральнасці назваў унутрыпаселішчных лінейных аб’ектаў у тапаніміконе Магілёўшчыны, вызначаюцца фактары і прычыны гэтай з’явы, выяўляюцца рэсурсы для ўстаранення ўрбананімнай аднайменнасці на прыкладзе ўрбананімікона г.п. Бялынічы. У залежнасці ад частаты паўтаральнасці ў розных паселішчах вылучаецца пяць катэгорый гэтых адзінак, у адпаведнасці з якімі праводзіцца ранжыраванне урбанонімаў. Сцвярджаецца, што паўтаральнасць назваў унутрыгарадскіх аб’ектаў – гэта адна з самых адметных рыс не толькі аналізаванага ўрбананімікона, але і ўрбананімнай прасторы Беларусі ўвогуле. Сярод фактараў, што абумоўліваюць самую высокую папулярнасць гэтым назвам, называюцца адпаведнасць існуючай ландшафтнай мадэлі прасторы ў тапаніміі Беларусі і выкарыстанне сімвалаў савецкай эпохі. У якасці рэсурсаў для ўстаранення ўрбананімнай аднайменнасці рэкамендуюцца найменні, звязаныя з гісторыяй Беларусі і найперш з гісторыяй паселішча, у якім яны функцыянуюць.*

***Ключавыя словы:*** *анамастыка, гаданімія, тапанімікон, урбананімная прастора, урбанонім.*

**Уводзіны.** Кожная з навук, анамастыка ў іх ліку, характарызуецца сваім наборам працэдур дасягнення мэт даследавання. Навуковыя метады вызначаюць шляхі пазнання і тлумачэння онімных фактаў, дазваляюць кваліфікаваць гэтыя факты, атрымліваць іх розныя навуковыя адлюстраванні. У рамках асобнага метада існуюць свае прыёмы і аперацыі, што служаць інструментам для даследавання таго ці іншага аспекта анамастыкі. У наш час ва ўсіх галінах навукі, у тым ліку і ў мове, атрымалі шырокае прымяненне колькасныя метады. Ужываецца лінгвастатыстыка і ў анамастыцы. Так, выкарыстанне статыстычнага метаду заснавана на тым, што ў аб’екта вывучэння, акрамя яго якаснага боку, вызначаецца і аналізуецца бок колькасны.

Статыстычнае выражэнне могуць атрымліваць вынікі лінгвасацыялагічных даследаванняў тапаніміі, напрыклад, дадзеныя пра паўтаральнасць назваў унутрыгарадскіх лінейных аб’ектаў. Перад анаматолагамі стаяла і да гэтага часу стаіць складаная праблема параўнання назваў вуліц у розных населеных пунктах. Аднымі з першых, па нашых дадзеных, такую працу распачалі польскія даследчыкі ўрбананімнага матэрыялу [1]. Э. Барысяк у дакладзе, прачытаным у 2006 г. на міжнароднай навуковай канферэнцыі “Nowe nazwy własne – nowe tendencje badawcze”, супастаўляе частотнасць ужывання ўрбанонімаў у сучасных польскіх паселішчах. Аўтар праводзіць фрэквентатыўны аналіз 35 найбольш папулярных назваў вуліц і плошчаў гарадоў Польшчы, у выніку чаго вылучае сярод іх дзве асноўныя групы – 1) найбольш старажытныя, якія ўзыходзяць да апелятываў, і 2) мемаратыўныя назвы, дадзеныя ў гонар найбольш вядомых асоб, што маюць дачыненне да польскай гісторыі, духоўнай спадчыны, навукі, літаратуры, мастацтва [2].

**Мэта даследавання** – вызначэнне фактараў і прычын з’яўлення адных і тых назваў вуліц у розных паселішчах Магілёўскай вобласці, выяўленне рэсурсаў для ўстаранення ўрбананімнай аднайменнасці на прыкладзе ўрбананімікона г.п. Бялынічы.

Апроч элементаў статыстычнага метаду, у даследаванні выкарыстаны дэскрыптыўны (збор, сістэматызацыя, абагульненне і інтэпрэтацыя онімнага матэрыялу), параўнальна-супастаўляльны метады.

Матэрыялам даследавання паслужылі дадзеныя Дзяржаўнага кадастравага агенцтва Рэспублікі Беларусь – унутрыгарадскія і ўнутрысельскія гадонімы Магілёўскай вобласці агульнай колькасцю 10859 адзінак.

**Асноўная частка.** Нягледзячы на тое, што мясцовасць, на якой знаходзіцца гарадскі пасёлак Бялынічы, заселена ў глыбокай старажытнасці, пра што сведчыць стаянка бронзавага веку за 4 км на паўднёвы захад ад пасёлка, паводле пісьмовых крыніц, Бялынічы вядомы толькі з 1577 г. як вёска ў складзе маёнтка Цяцерын, што належаў князю С.А. Збарожскаму, які і заснаваў замак Белагарадок і мястэчка. Што да назваў вуліц апошняга, то да нашага часу яны застаюцца нявысветленымі. Вядома толькі, што ў 1620 г. у мястэчку было 331 вулічны і 16 гандлёвых пляцаў [3, с. 166].

Сучасны ўрбананімікон гарадскога пасёлка налічвае 94 назвы ўнутрыгарадскіх лінейных аб’ектаў, з якіх толькі 19 аўтахтонныя, гэта значыць назвы, якія існуюць толькі ў тым паселішчы, дзе яны ўзніклі (назвы падаюцца ў арфаграфіі крыніцы: *ул. Д. Давыдова, ул. Дайнеко, Задрутская ул., ул. Китаева, Круглянская ул., ул. Миколуцкого, Михайловская ул., Мокровская ул., ул. Острожского, ул. Панченко, Привольная ул., Просторная ул., Просторный пер., ул. Сапеги, ул. Свидинского, ул. Селицкого, ул. Телешева, Чёновский пер.,*

*ул. Черновского*). Большасць назваў, як відаць з пералічанага, прысвоена лінейным аб'ектам у гонар знакамітых людзей, што пакінулі асаблівы след у гісторыі Бялынічаў.

З прыведзеных дадзеных вынікае, што 75, або 80%, назваў вуліц г.п. Бялынічы выкарыстоўваюцца ў іншых населеных пунктах Магілёўскай вобласці.

У залежнасці ад частаты паўтаральнасці ў розных паселішчах гэтыя назвы можна падзяліць на некалькі катэгорый:

I – паўтараюцца ў 300 і болей населеных пунктах (далей н.п.)
II – паўтараюцца ў 200 і болей н.п.
III – паўтараюцца ў 100 і болей н.п.
IV – паўтараюцца ў 10 і болей н.п.
V – паўтараюцца ў 2–9 н.п.

Першую катэгорыю рэпрэзентуюць два найпапулярнейшых урбанонімы – *Садовая ул. / Садовый пер.* (паўтараецца ў 344 н.п.), *Лесная ул. / Лесной пер.* (311 н.п.), якія функцыянуюць у розных паселішчах у разнастайных структурных і марфалагічных мадэлях: *1-й Садовый пер., 2-й Садовый пер., 3-й Садовый пер., 4-й Садовый пер., 5-й Садовый пер.; 2-я Лесная ул., ул. Лесной Ручей, 1-й Лесной пер., 2-й Лесной пер.*

Сярод фактараў, што абумоўліваюць самую высокую папулярнасць гэтых назваў, – адпаведнасць існуючай ландшафтнай мадэлі прасторы ў тапаніміі Беларусі ўвогуле. Ва ўрбананіміі *сад* і *лес* – не проста аб'екты, у напрамку да якіх вуліцы вядуць, а яшчэ і элементы прасторавай мадэлі, і своеасаблівыя сімвалы-"спадзёвы" на ўнармаванае і забяспечанае жыццё. Вядома, што найважнейшымі элементамі ландшафту Беларусі, як і многіх іншых рэгіёнаў, з'яўляюцца лясныя масівы: лес – гэта крыніца жыцця, якая забяспечвае людзей палівам, харчаваннем і сыравінай для прадукцыйнай дзейнасці. Відаць, менавіта таму ў гаданіміі Магілёўшчыны назвы, што ўтвораны ад лексемы *лес*, сустракаюцца вельмі часта. Што да другой лексемы, то "у многіх міфалагічных традыцыях *сад* стасуецца з выраем, дзе разнастайныя пладовыя дрэвы і на іх птушкі" [1, с. 446].

Нязначна саступаюць па папулярнасці ўрбанонімы другой катэгорыі, што ўключаюць назвы *Молодежная ул. / Молодежный пер. / Молодежный бульвар* (298 н.п.), *Школьный пер. / Школьная ул.* (214 н.п.), *Полевая ул. / Полевой пер.* (210 н.п.), сярод якіх апошняя зноў-такі звязана з элементам ландшафтнага кода традыцыйнай беларускай мадэлі свету – *полем*, станоўчы патэнцыял якога "абумоўлены актыўнай прысутнасцю чалавека, яго працай і гаспадарчай дзейнасцю" [1, с. 385]. Нельга не пагадзіцца з аўтарамі прыведзенага меркавання, у адпаведнасці з якім "наогул лексема *поле* ў свядомасці беларусаў ужываецца не толькі ў сваім наўпростым значэнні, але ўваходзіць у шэраг абазначэнняў абстрактных ідэй і паняццяў" [4, с. 385].

Сімвалічна, што ў рэестр назваў другой катэгорыі ўваходзіць і ўрбанонім *Молодежная ул. / Молодежный пер. / Молодежный бульвар*, функцыянаванне якога некаторыя даследчыкі звязваюць з данінай модзе. На наш погляд, папулярнасць гэтай назвы абумоўлена іншымі сацыяльнымі фактарамі, найперш тым, што «моладзь з'яўляецца свайго роду рэзервам, які выступае на пярэдні план, калі такое ажыўленне становіцца неабходным для прыстасавання да хутка зmяняльных або якасна новых абставін" [5].

Другую катэгорыю рэпрэзентуе і ўрбанонім *Школьный пер.*, які адрозніваецца сваёй частотнасцю пачынаючы з XVI–XVIII стст. Утвораны ад наймення найбольш важнага для арыентацыі ў горадзе кропкавага аб'екта, ён насычаны таксама экстралінгвістычным зместам – сведчаннем пра пэўную культурную каштоўнасць.

Трэцяя катэгорыя ўнутрыпаселішчных назваў аб'ядноўвае ўрбанонімы, што функцыянуюць ва ўрбананіміконах ад 100 да 200 паселішчаў: *Заречная ул. / Заречный пер.; Луговая ул., 1-я Луговая ул., 2-я Луговая ул., 3-я Луговая ул.) / Луговой пер. / Луговой проезд; Советская ул. / Советская пл., / Советский пер. (1-й Советский пер., 2-й Советский пер.), Первомайская ул. / Первомайский пер.* Невялікая па колькасці кампанентаў катэгорыя ў сваю чаргу падзяляецца на дзве разнавіднасці. Першая з іх арыентавана на фіксацыю геаграфічных каардынат размяшчэння лінейнага аб'екта (вуліца, што знаходзіцца за ракой, – *Зарэчная*, што вядзе да луга, – *Лугавая, Лугавы завул.* і да т.п.); другая – на сімвалы савецкай эпохі (пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 года свята 1 Мая стала афіцыйным, маёўкі насілі палітычны характар і суправаджаліся масавымі дэманстрацыямі працоўных).

Пераходзячы да чацвёртай катэгорыі, якая аб'ядноўвае ўрбанонімы, што паўтараюцца ва ўрбананіміконах 10–100 паселішчаў, трэба адзначыць, што колькасна яна пераўзыходзіць папярэднія амаль ў 10 разоў і ўключае некалькі разнавіднасцей найменняў, базай для ўзнікнення якіх сталі:

1) асаблівасці размяшчэння лінейнага аб'екта: *Набярэжная вул., Набережная ул. / Набережный пер., 2-й Набережный пер., 3-й Набережный пер.* (84 н.п.), *1-я Восточная ул., Восточная ул. / Восточный пер.* (60 н.п.), *Северный пер. / Северный въезд / Северная ул.* (57 н.п.), *Западная ул. / Западный пер.* (35 н.п.), *Приозерная ул. / Приозерный пер.* (25 н.п.), *Дальний пер. / Дальняя ул.* (13 н.п.);

2) назвы прадметаў, што прыносяць задавальненне, добры настрой, спрыяюць паляпшэнню здароўя: *Солнечная ул. / Солнечный пер.* (91 н.п.), *Цветочная ул. / Цветочный пер. / Цветочный проезд* (39), *Весенняя ул. / Весенний пер., 1-й Весенний пер., 2-й Весенний пер., 3-й Весенний пер., 4-й Весенний пер.* (23 н.п.);

3) імёны і прозвішчы знакамітых людзей:

а) рускіх і беларускіх пісьменнікаў і паэтаў, вучоных: *ул. Пушкина / пер. Пушкина / проспект Пушкина / Пушкинская ул. / Пушкинский пер.* (30 н.п.); *ул. М. Горького / пер. Горького / ул. Максима Горького / въезд Горького / пер. Максима Горького* (26 н.п.); *ул. Я. Купалы / пер. Я. Купалы / 1-ый пер. Я. Купалы, 3-ий пер. Я. Купалы* (23 н.п.); *ул. Некрасова / пер. Некрасова / 1-й пер. Некрасова, 2-й пер. Некрасова, 3-й пер. Некрасова, 4-й пер. Некрасова, 5-й пер. Некрасова* (21 н.п.); *ул. Мичурина / пер. Мичурина* (21 н.п.), *ул. Я. Коласа / пер. Якуба Коласа* (19 н.п.); *ул. Лермонтова / пер. Лермонтова, 2-й пер. Лермонтова* (18 н.п.); *ул. Островского* (11 н.п.); *ул. Маяковского / пер. Маяковского* (10 н.п.);

б) першага касманаўта планеты Зямля: *ул. Гагарина / пл. Гагарина / пер. Гагарина* (37 н.п.);

в) дзяржаўных і палітычных дзеячаў: *Ленинская ул. / пл. Ленина / ул. Ленина / бульвар Ленина / Ленинский бульвар / Ленинский пер. / 1-й Ленинский пер., 2-й Ленинский пер., 3-й Ленинский пер. / Ленинский въезд* (77 н.п.); ул. Кирова / пер. Кирова (37 н.п.); *ул. Калинина / пер. Калинина / въезд Калинина* (36 н.п.);

г) военачальнікаў, удзельнікаў паўстанняў і войнаў, партызан: *ул. Чапаева / пер. Чапаева, / проезд Чапаева* (23 н.п.), *ул. Заслонова / пер. Заслонова* (21 н.п.), *ул. Якубовского* (11 н.п.);

д) заснавальнікаў навуковага камунізма: *ул. Энгельса / 1-й пер. Энгельса, 2-й пер. Энгельса, 3-й пер. Энгельса / ул. Фридриха Энгельса* (20 н.п.), *ул. Карла Маркса / пер. Карла Маркса* (18 н.п.);

4) сімвалы савецкай улады: *Пионерская ул. / Пионерский пер.* (46 н.п.), *Коммунистическая ул. / Коммунистический пер., 1-й Коммунистический пер. / Коммунистический въезд* (26 н.п.), *Совхозная ул. / Совхозный пер., 3-й Совхозный пер.* (24 н.п.), *Красноармейская ул. / Красноармейский пер. / Красноармейский спуск* (19 н.п.), *ул. 70 лет Октября / пер. 70 лет Октября* (12 н.п.);

5) асобныя найбольш значныя ў сацыяльным плане аб’екты: *Заводская ул., 2-ая Заводская ул., 3-я Заводская ул. / Заводской пер., 1-ый Заводской пер., 2-ой Заводской пер., 3-ий Заводской пер.* (53 н.п.), *Почтовая ул. / Почтовый пер.* (19 н.п.), *Дачный пер. / Дачный посёлок / Дачная ул., 2-я Дачная ул., 3-я Дачная ул.* (12 н.п.).

Дваццаць дзве асновы сталі базай для ўтварэння назваў унутрыпаселішчных лінейных аб’ектаў, што рэпрэзентуюць пятую катэгорыю. Яна аб’ядноўвае ўрбанонімы і віконімы, якія паўтараюцца толькі ў 2–9 паселішчах. Менавіта гэтыя найменні маюць самае цеснае дачыненне да гісторыі Беларусі (параўнаем: *Белорусская ул., ул. Калиновского / 1-й пер. Калиновского, 2-й пер. Калиновского, ул. Франциска Скорины, ул. Машерова, Криничная ул. / Крыничная ул. / Криничный пер., Минская ул. / Минский пер., Светлая ул. / Светлый пер., 1-й Светлый пер., 2-й Светлый пер., ул. 60 лет Октября / пер. 60 лет Октября, ул. М. Богдановича / ул. Максима Богдановича, пер. Богдановича, Крестьянская ул. / Крестьянский пер., Шкловский пер. / Шкловское шоссе, ул. 40 лет Победы, ул. 50 лет Октября, Полоцкая ул., Славянская ул., Оборонная ул.*) і гісторыі паселішча, у якім яны функцыянуюць: *ул. Б-Бирули, ул. Бялыницкого-Бирули / 1-й пер. Белыницкого-Бирули, 2-й пер. Белыницкого-Бирули, 3-й пер. Белыницкого-Бирули, 4-й пер. Белыницкого-Бирули, ул. Гришиша, ул. Лорченко, ул. Терешкевича, ул. Хигрина.*

Калі разглядаць назвы як адзінкі канкрэтнага ўрбананімікона, то кожная з іх мае сваё месца ў ім і адпавядае пэўнаму рангу, які назва вуліцы атрымлівае ў залежнасці ад колькасці паселішчаў, у якіх яна існуе, і выяўленай катэгорыі (гл. табліцу).

Табліца. – Катэгорыі і рангі назваў вуліц г.п. Бялынічы ва ўрбананіміконе Магілёўшчыны

| Назва аб’екта | Колькасць паселішчаў, у якіх існуе назва | Катэгорыя назвы | Ранг назвы |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **1. Садовая ул.**, 1-я Садовая ул., 2-я Садовая ул., Садовый пер., 1-й Садовый пер., 2-й Садовый пер., 3-й Садовый пер., 4-й Садовый пер., 5-й Садовый пер. | 344 | I | 1 |
| **2. Лесная ул.**, 2-я Лесная ул., ул. Лесной Ручей, Лесной пер., 1-й Лесной пер., 2-й Лесной пер. | 311 | I | 2 |
| **3. Молодежная ул.**, Молодежный пер., Молодежный бульвар | 298 | II | 3 |
| **4. Школьный пер.**, Школьный пер., Школьная ул. | 214 | II | 4 |
| **5. Полевая ул.**, Полевая 1 ул., Полевой пер. | 210 | II | 5 |
| **6. Заречная ул.,** Заречный пер. | 183 | III | 6 |
| **7. Луговая ул.,** 1-я Луговая ул., 2-я Луговая ул., 2-ая Луговая ул., 1-я Луговая ул., 2-я Луговая ул., 3-я Луговая ул., Луговой пер., Луговой проезд | 180 | III | 7 |
| **8. Советская ул.**, Советский пер., 1-й Советский пер., 2 й Советский пер., Советский посёлок, Советская пл. | 177 | III | 8 |
| **9. Первомайская ул.,** Первомайский пер. | 101 | III | 9 |
| **10. Солнечная ул.,** Солнечный пер. | 91 | IV | 10 |

Продолжение таблицы

| 1 | 2 | 3 | 4 |
|---|---|---|---|
| **11. Набережная ул.,** Набережный пер., 2-й Набережный пер., 3-й Набережный пер., Набярэжная вул. | 84 | IV | 11 |
| **12. Юбилейная ул.,** Юбилейный пер., 1-й Юбилейный пер., 2-й Юбилейный пер. | 79 | IV | 12 |
| **13. Ленинская ул.,** пл. Ленина, ул. Ленина, бульвар Ленина, Ленинский бульвар, Ленинский пер., 1-й Ленинский пер., 2-й Ленинский пер., 3-й Ленинский пер., Ленинский въезд | 77 | IV | 13 |
| **14. 1-я Восточная ул.**, Восточная ул, Восточный пер. | 60 | IV | 14 |
| **15. Северный пер**., Северный въезд, Северная ул. | 57 | IV | 15 |
| **16. Заводская ул.,** Заводской пер., 2-ая Заводская ул., 3-я Заводская ул., 1-ый Заводской пер., 2-ой Заводской пер., 3-ий Заводской пер. | 53 | IV | 16 |
| **17. Парковая ул.,** Парковый пер., Парковый проезд | 52 | IV | 17 |
| **18. Пионерская ул.,** Пионерский пер. | 46 | IV | 18 |
| **19. Цветочная ул.,** Цветочный пер., Цветочный проезд | 39 | IV | 19 |
| **20. ул. Гагарина,** пл. Гагарина, пер. Гагарина | 37 | IV | 20 |
| **21. ул. Кирова,** пер. Кирова | 37 | IV | 20 |
| **22. Калинина ул.,** пер. Калинина, въезд Калинина | 36 |  | 21 |
| **23. Западная ул.**/ Западный пер. | 35 | IV | 22 |
| **24. ул. Строителей,** пер. Строителей, проспект Строителей, проезд Строителей, Строительная ул., 1-й Строительный пер., 2-й Строительный пер. | 35 | IV | 22 |
| **25. ул. Пушкина,** пер. Пушкина, проспект Пушкина, Пушкинская ул., Пушкинский пер. | 30 | IV | 23 |
| **26. ул. М. Горького,** пер. Горького, ул. Максима Горького, въезд Горького, пер. Максима Горького | 26 | IV | 24 |
| **27. Коммунистическая ул.,** Коммунистический пер., 1-й Коммунистический пер., Коммунистический въезд | 26 | IV | 24 |
| **28. Приозерная ул.,** Приозерный пер. | 25 | IV | 25 |
| **29. ул. Чкалова**, пер. Чкалова, Чкаловская ул., 1-й пер. Чкалова, 2-й пер. Чкалова | 25 | IV | 25 |
| **30. Совхозная ул. ,** Совхозный пер., 3-й Совхозный пер. | 24 | IV | 26 |
| **31. Весенняя ул.,** Весенний пер., 1-й Весенний пер., 2-й Весенний пер., 3-й Весенний пер., 4-й Весенний пер. | 23 | IV | 27 |
| **32. ул. Чапаева,** пер. Чапаева, проезд Чапаева | 23 | IV | 27 |
| **33. ул. Я. Купалы**, пер. Я. Купалы, 1-ый пер. Я. Купалы, 3-ий Я. Купалы пер. | 23 | IV | 27 |
| **34. Сосновая ул.,** Сосновый пер. | 23 | IV | 27 |
| **35. ул. Заслонова,** пер. Заслонова | 21 | IV | 28 |
| **36. ул. Мичурина,** пер. Мичурина | 21 | IV | 28 |
| **37. ул. Некрасова**, пер. Некрасова, 1-й пер. Некрасова, 2-й пер. Некрасова, 3-й пер. Некрасова, 4-й пер. Некрасова, 5-й пер. Некрасова | 21 | IV | 28 |
| **38. ул. Энгельса**, 1-й пер. Энгельса, 2-й пер. Энгельса, 3-й пер. Энгельса, ул. Фридриха Энгельса | 20 | IV | 29 |
| **39. ул. Я. Коласа**, пер. Якуба Коласа | 20 | IV | 29 |
| **40. Красноармейская ул.,** Красноармейский пер., Красноармейский спуск | 19 | IV | 30 |
| **41. Почтовая ул.,** Почтовый пер. | 19 | IV | 30 |
| **42. ул. Лермонтова,** пер. Лермонтова, 2-й пер. Лермонтова | 18 | IV | 31 |
| **43. ул. Карла Маркса,** пер. Карла Маркса | 18 | IV | 31 |
| **44. Дальний пер.,** Дальняя ул. | 13 | IV | 32 |
| **45. ул. 70 лет Октября,** пер. 70 лет Октября | 12 | IV | 33 |
| **46. Дачный пер.,** Дачный посёлок, Дачная ул., 2-я Дачная ул., 3-я Дачная ул. | 12 | IV | 33 |
| **47. ул. Островского** | 11 | IV | 34 |
| **48. ул. Якубовского** | 11 | IV | 34 |
| **49. ул. Маяковского,** пер. Маяковского | 10 | IV | 35 |
| **50. Белорусская ул.** | 9 | V | 36 |

Окончание таблицы

| 1 | 2 | 3 | 4 |
|---|---|---|---|
| **51. Ул. Калиновского,** 1-й пер. Калиновского, 2-й пер. Калиновского | 9 | V | 36 |
| **52. Минская ул.,** Минский пер., Минское шоссе | 9 | V | 36 |
| **53. ул. Франциска Скорины** | 8 | V | 37 |
| **54. ул. Б-Бирули,** ул. Бялыницкого-Бирули, 1-й пер. Белыницкого-Бирули, 2-й пер. Белыницкого-Бирули, 3-й пер. Белыницкого-Бирули, 4-й пер. Белыницкого-Бирули | 7 | V | 38 |
| **55. Криничная ул**., Крыничная, Криничный пер. | 7 | V | 38 |
| **56. ул. Машерова** | 7 | V | 38 |
| **57. Светлая ул.,** Светлый пер., 1-й Светлый пер., 2-й Светлый пер. | 7 | V | 38 |
| **58. ул. 60 лет Октября,** пер. 60 лет Октября | 7 | V | 38 |
| **59. ул. М. Богдановича,** ул. Максима Богдановича, пер. Богдановича | 6 | V | 39 |
| **60. Крестьянская ул.,** Крестьянский пер. | 4 | V | 40 |
| **61. Шкловский пер.,** Шкловское шоссе | 4 | V | 40 |
| **62. ул. 40 лет Победы** | 4 | V | 40 |
| **63. ул. 50 лет Октября** | 3 | V | 41 |
| **64. Полоцкая ул.** | 3 | V | 41 |
| **65. Славянская ул.** | 3 | V | 41 |
| **66. ул. Гришина** | 2 | V | 42 |
| **67. ул. Лорченко** | 2 | V | 42 |
| **68. Оборонная ул.** | 2 | V | 42 |
| **69. ул. Терешкевича** | 2 | V | 42 |
| **70. ул. Хигрина** | 2 | V | 42 |

Параўнанне першага дзясятка найбольш частотных сучасных гадонімаў Віцебскай, Гомельскай, Гродзенскай [6, с. 108] і Магілёўскай абласцей паказвае больш падабенства, чым адрознення: за выключэннем дзвюх, восем назваў у абодвух спісах аднолькавыя, яны адрозніваюцца толькі рангам, што пацвярджае тэзіс аб рэгіянальнай распаўсюджанасці адных і тых жа найменняў лінейных аб’ектаў. Пры гэтым падобныя намінатыўныя працэсы, якія адбываюцца ў гаданіміконах розных тэрыторый, неканстантныя, паколькі ў кожным канкрэтным рэгіёне могуць існаваць свае перавагі пры намінацыі вуліц, якія вызначаюць тэрытарыяльную частотнасць іх назваў. Адрозненні ў намінацыйных прыярытэтах абумоўлены гістарычнымі, сацыяльнымі фактарамі развіцця рэгіёнаў, living рознымі ўяўленнямі чалавека аб навакольным свеце.

**Заключэнне.** Такім чынам, праведзенае даследаванне ўрбананімікона Магілёўшчыны дазваляе сцвярджаць, што паўтаральнасць назваў унутрыгарадскіх аб’ектаў – гэта адна з самых адметных рыс не толькі аналізаванага іменніка, але і ўрбананімнай прасторы Беларусі ўвогуле. Сярод фактараў, што абумоўліваюць самую высокую папулярнасць гэтым назвам, адпаведнасць існуючай ландшафтнай мадэлі прасторы ў тапаніміі Беларусі, у тым ліку фіксацыя геаграфічных каардынат размяшчэння лінейнага аб’екта; выкарыстанне сімвалаў савецкай эпохі. У якасці рэсурсаў для ўстаранення ўрбананімнай аднайменнасці можна разглядаць найменні, звязаныя з гісторыяй Беларусі і найперш з гісторыяй паселішча, у якім яны функцыянуюць.

Атрыманыя намі вынікі – сведкі таго, што анамастычная статыстыка назваў вуліц дапамагае адкрыць пэўныя заканамернасці фарміравання ўрбананімнай і віканімнай сістэм беларускага народа і стаць асновай для лінгвакультуралагічных і этналінгвістычных пабудоў.

ЛІТАРАТУРА

1. Skowronek, K. Współczesne, najczęściej używane nazwiska polskie / K. Skowronek // Antroponimia słowiańska: Materiały z IX Ogólnopolskiej Konferencji Onomastycznej, Warszawa, 6–8 XI 1994 / red.: E. Wolnicz-Pawłowska, J. Duma. – Warszawa : Slawistyczny Ośrodek Wydawniczy, 1996. – S. 291–299.
2. Borysiak, E. Aktualne, najczęściej występujące w polskich miastach nazwy ulic / E. Borysiak // Nowe nazwy własne – nowe tendencje badawcze / pod. redakcją A. Cieślikowej, B. Czopek-Kopciuch i K. Skowronek. – Kraków : Wydawnictwo PANDIT, 2007. – S. 449-456.
3. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: Б.І. Сачанка (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1993–2003. – Т. 2 : Беліцк – Гімн. – 1994. – 537 с.

4. Беларуская міфалогія : энцыклапед. слоўн. / С. Санько [і інш.]. – Мінск : Беларусь, 2004. – 592 с.
5. Молодежь [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://ru.wikipedia.org/wiki/Молодежь. – Дата доступа: 06.07.2020.
6. Мезенко, А.М. Частотность годонимов как экспонент культурноисторической информации / А.М. Мезенко // Изв. Смолен. гос. ун-та. – 2017. – № 2 (38). – С. 106–113.

*Паступіў 27.07.2020*

**STREET NAMES OF URBAN SETTLEMENT BIALYNICHY IN THE TOPONYMICON OF THE MOGILEV REGION: THE PROBLEM OF REPETITIVENESS**

***H. MEZENKA***

*The article examines the problem of repetitiveness of names of intra-settlement linear objects in the toponymicon of Mogilev region, specifies the factors and causes of this phenomenon, identifies resources for the elimination of urban omonymy through the example of urbanonymicon of urban settlement Bialynichy. Depending on the frequency of repetition in different settlements, five categories of these units are specified, according to which urbanonyms are ranked. It is claimed that repetitiveness of the names of intra-city objects is one of the most distinctive features of not only the analyzed urbanonymicon, but also of the urbanonymic space of Belarus in general. Among the factors which determine the highest popularity of these names are the correspondence of the existing landscape model of space in the toponymy of Belarus to the use of symbols of the Soviet era. As resources for the elimination of urban anonymity, names related to the history of Belarus and, first of all, to the history of the settlement in which they operate are recommended.*

***Keywords:*** *onomastics, godonymy, toponymicon, urbanonymous space, urbanonym.*